© PDF: Kamunikat.org 2013

ДУМКІ й ПАГЛЯДЫ

Дадатак да «Беларускага Сьвету», № 3.

МАКСІМ ГАРЭЦКІ (1893 - 1939)

Літаратурная спадчына выдатнага беларускага пісьменьніка, аднаго з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы, вучонага й літаратурнага крытыка, зьбіральніка ды прапагандыстага беларускай літаратуры адраджэнскага напрамку — гэта былі перш за ўсё сацыяльныя апавяданьні, філязофскія эсэ, драматычныя абразкі, якія ўваходзілі ў зборнікі «Рунь», «Досьвіткі», ведамыя аповесьці: «Ціхая плынь», «Мэлянхолія», драматычная аповесьць «Антон», мастацка-дакументальная кніга «На імпэрыялістычнай вайне», раман «Віленскія камунары» й менш ведамая «Камароўская хроніка».

Многае з напісанага М. Гарэцкім сёньня ўжо ведама шырокаму чытачу: у 1973 годзе выйшлі «Выбраныя творы» пісьменьніка ў 2-х томах. Многа яго твораў перакладзены на расейскую мову, сярод іх — «Віленскія камунары», «Ціхая плынь», «На імпэрыялістычнай вайне», апавяданьні.

У апошнія гады былі напісаныя цікавыя, зьмястоўныя працы прысьвечаныя аўтару «Гісторыі беларускай літаратуры», «Руні», «Антона», «Чырвоных руж».

Памінаючы ўсё зробленае нашыя дасьледнікі й выдаўцы яшчэ ў вялікім даўгу перад памяцьцю пісьменьніка, які ўнёс вялікі ўклад у беларускую літаратуру, навуку й культуру. Гаворка йдзе аб тым, што творы М. Гарэцкага, у тым ліку й двухтомнік «Выбранае», ужо сталі бібліяграфічнай рэдкасьцю. Яны даўно не перавыдаюцца, што, бязумоўна, стрымлівае далейшае вывучэньне шматграннай спадчыны гэтага арыгінальнага пісьменьніка. А па-другое, «Выбранае» ўключала ня ўсё нават з мастацкіх твораў, не гаворачы пра публіцыстычны жанр і навуковую ды літіратурна-крытычную спадчыну...

Каб задаволіць даўно насьпелыя патрэбы літаратурнай і навуковай грамадзкасьці, у БССР вынесьлі пастанову выдаць збор твораў М. Гарэцкага ў 4-х томах. Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы ў адпаведнасьці з гэтай пастановай выдаў збор твораў Гарэцкага ў 4-х томах. Гэта першы савецкі дазвол выдаць цэнзурнае выданьне спадчыны М. Гарэцкага. Гэта таксама першы збор твораў Гарэцкага наагул, бо ні пры жыцьці пісьменьніка, ні пасьля яго сьмерці, ягоная спадчына ў зборы твораў не друкавалася...

Зыходзячы з тыпу выданьня, складальнікі ўважліва прагледзелі тэкст кожнага твору з усімі прыжыцьцёвымі публікацыямі ды з рукапісамі, (калі яны захаваліся), занатавалі ўсе варыянты й разначытаньні, у многіх выпадках укладальнікі крыніцу першадруку й дату напісаньня выправілі. Інакш кажучы, тэксталёгі далі ў рукі дасьледчыкаў творчасьці М. Гарэцкага выпраўлены тэкст... У гэтым і

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

заключаецца «навуковая» вартасьць новага збору твораў.

Абмежаваныя памеры кожнага паасобнага тому не дазволілі зьмясьціць у разьдзеле «Камэнтары» ўсе варыянты першапачатковага тэксту, раньнія рэдакцыі ды розначытаньні. Падаюцца адно найбольш значныя ў ідэйна-мастацкіх адносінах, найбольш выпраўленыя фрагмэнты. Але й тое, што ўключана, думаецца, дапаможа чытачу скласьці больш поўнае ўяўленьне пра Гарэцкага-мастака й характар ягонай працы.

Выхад збору твораў М. Гарэцкага, бясспрэчна, актывізуе беларускую навуковую думку. Самымі багатымі на весткі з жыцьцёвых дарог пісьменьніка аказаліся ўспаміны яго дачкі ды брата, акадэміка Гарэцкага, багатыя камантары да зборніка падрыхтаваныя І. Саламевічам.

В. Пануцэвіч.

Падпісвайцеся на:

ЗБОР ТВОРАУ МІХАСЯ КАВЫЛЯ

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва пачаў працу над выданьнем твораў ведамага беларускага нацыянальнага паэта й пісьменьніка Міхася Кавыля. Збор твораў М. Кавыля будзе абыймаць ягоную паэзію й прозу, крытычна-аналітычны агляд творчасьці, біяграфію, бібліяграфію й ліставаньне.

Гэтае акадэмічнае выданьне станецца, бясспрэчна, каштоўным укладам у беларускую нацыянальную літаратуру. Дарэчы, уклад М. Кавыля ў беларускую літаратуру й дасюль выдатны — Кавыль першы ў беларускай паэзіі, хто стварыў вянок санэтаў, а таксама першую і адзіную тымчасам у нас карону санэтаў.

Як і ўсё папярэднія літаратурныя выданьні Інстытуту, таксама й выданьне твораў Міхася Кавыля разьлічанае на фінансавае падтрыманьне яго з боку беларускага грамадзтва. Для належнага выданьня кнігі, канечна патрэбная дапамога беларускага грамадзтва, і ўправа Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва зьвяртаецца да ўсіх з просьбай падтрымаць гэтае важнае выданьне, перасылаючы падпіску ці ахвяру на друк кнігі. Кошт падпіскі — 20 амэрыканскіх даляраў.

Чэкі просіцца выпісваць на:

Byelorussian Institute of Arts and Sciences
230 Springfield Ave.
Rutherford, N. J. 07070
U. S. A.

Ад Рэдактара:

Наступнае выданьне «Беларускага Сьвету» заплянавана на восень 1983 году. Матэрыялы ў часопіс просіцца перасылаць не марудзячы.

Дзе можна набыць «Беларускі Сьвет» у Канадзе?.. Нідзе. Наш часопіс выпісвае толькі адна інтэлігентная беларуская сям'я ў Канадзе — гэта сям'я Пашкевічаў. І гэта ўсё.

Будзем старацца знайсьці месца ў часопісе на «Зьмест». Я ведаю, што «Зьмест» патрэбны, але дзе яго прымасьціць?.. Няма месца.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

Каб адзначыць нейкае нядаўнае выданьне зь Беларусікі ў рубрыцы **Новае на Кніжнай Паліцы,** трэба пераслаць адзін экзэмпляр гэтага выданьня ў рэдакцыю «Беларускага Сьвету».

МАЕ РАЗВАЖАНЬНІ...

На судовай расправе ў Нью Брансвіку нехта са сьветкаў Кансысторыі ўпэўнена даказваў, што Праваслаўная царква вельмі падобная да Рыма-Каталіцкай царквы. Вядома, падабенства ёсьць — яны-ж хрысьціянскія, але... Праваслаўныя першаярархі ня могуць быць «непамыльнымі». Апошнім часам у нашай Праваслаўнай царкве справа непамыльнасьці набрала на сіле, асабліва наглядаецца гэта ў Кансысторыі.

Ня трэба забывацца, што галоўная розьніцца між Праваслаўнаю й Каталіцкаю царквою ёсьць у тым, што першая — Саборная, а другая — Аўтарытатыўная.

Нашыя царкоўныя дзеячы ня грэшаць сьветлым розумам. Вось прыклады: Вялікімі ахвярамі набылі Беларусы Бэл-Эр «Менск» — цяпер ён пустуе, а гэта таму, што ўмяшаліся царкоўныя дзеячы. У Нью Ёрку за ахвяры людзей купілі сабор для БАПЦ — цяпер ён таксама стаіць пустым.

Кансысторыя пры дапамозе чужынцаў хоча адсудзіць іншыя цэрквы ад сваіх былых парахвіянаў, якія будаваліся за мазольныя грошы, а кім гэтыя цэрквы запоўняць?... Вось тут увідачняецца дзейнасьць нашых гарастратаў. Тыя, што развальваюць нашу БАП Царкву прысягалі ёй служыць найсьвяцейшымі пачуцьцямі беларускага патрыятызму, але выглядае, што служаць яны зусім нечаму іншаму...

А. Ж.

Чаму Перастаў публікавацца «Голас Царквы»?

Пачынаючы з 1955 году я старанна зьбіраў кожны выпуск часопісу «Голас Царквы», — афіцыяльнага воргану Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы.

Спачатку часопіс рэдагаваў сам Уладыка Васіль, які вельмі добра ведаў беларускую мову й таму «Голас Царквы» быў заўсёды на высокім літаратурным і рэлігійным узроўні.

Пасьля сьмерці Уладыкі Васіля рэдактарства гэтага цікавага праваслаўнага часопісу, здаецца, пераняў Міхась Міцкевіч, які бязь цяжкасьці здолеў утрымаць той самы стыль і граматнасьць зьместу.

Бязь лішняе шуміхі (няраз фінансаваны ў большасьці самым рэдактарам), «Голас Царквы» годна рэпрэзантаваў праваслаўных беларусаў аж да 1980 году.

Мусіць у гэтым часе пачаўся разлад у БАПЦ, разлад запачаткаваны неразважнасьцю і ўпартасьцю мітрапаліта і ягоных «плаваючых у хмарах» дарадчыкаў.

Пачаліся суды, адвакацкая пад'юджанасьць, нізкая лаянка ды звычайная мана... і, зразумела што грошы з кансысторыі пачалі пераносіцца ў кішэні адвакатаў. Ясная рэч, што пры такім становішчы ў БАПЦ, грошай на выдаваньне «Голасу Царквы» не знайшлося...

Такім чынам, дзеля свае сьлепаты ды злосьці кансысторыя

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

заняпасьціла адзіны інтэлігентны і ясны сьветач беларускага праваслаўя — «Голас Царквы».

Ці адновіцца выдаваньне гэтага часопісу, цяпер цяжка сказаць, але ўсё паказвае на тое, што **не.** Ці-ж гэта не праступства?!

С. М.

— * —

Пастановы, Загады й ...

Часопіс «Час» за сакавік 1983 году зьмясьціў чарговую пастанову «сабору» БАПЦ (выглядае, што гэтыя саборы адбываюцца чуць ня кожны месяц) пра пазбаўленьне духоўнага сану Архіяпіскапа Мікалая. Чытаем: «... згодна якой былы Архіяпіскап Мікалай канчаткова пазбаўлены годнасьці япіскапскага сану і адлучаны ад БАПЦ і г.д...»

У мяне паўстае пытаньне: як можна **былога** Архіяпіскапа **канчаткова** пазбаўляць сану? Калі папярэднія пазбаўленьні сану былі толькі жартам, дык гэтая пастанова змахвае на канчатковую бязглуздзіцу. Ці-ж ня ведае правіца, што робіць лявіца?

I далей: «... Таму, каб захаваць БАПЦ ад розных варожых уплываў і дзеяньняў **загадваю** ўсяму Духавенству, усім Парафіяльным Радам і ўсім **вернікам...»**

Загадваць можна ў... арміі, але не ў царкве. Царкоўнае жыцьцё кіруецца пабожнасьцю, добрасумленьнем, любоўю, пашанаю ды іншымі дадатнімі рысамі людзкога характару, але ніколі злосьцю й загадамі. Трэба таксама зазначыць, што так званыя варожыя ўплывы й дзеяньні, гэта нішто іншае, як звычайная манія прасьледу. Даказваць гэта, здаецца, няма патрэбы.

Добрыя людзі! Ці вы ўжо канчаткова з глузду пазьяжджалі?!

Леваслаўны.

Дзеля таго, што на беларускай эміграцыйнай ніве апошнімі часамі адны сумныя падзеі, прашу зьмясьціць у Дадатку хоць гэтую жменю жартаў:

— Я зараз у даўгу па самыя вушы.
— Стань на галаву, і гэта будзе ня так і многа.

— Вам-жа нельга піць. Пашкадуйце жонку, дзяцей.
— Я іх шкадую... Ім не даю.

— Вы памятаеце, як абазвалі суседа?
— Не! Я не злапамятны...

— Ты ведаеш, якое няшчасьце здарылася зь небаракам Янкам?
— Не. Што такое?
— Ён уцёк з маёй жонкай.

Паважаныя чытачы! А як-жа з ахвяраю на «Беларускі Сьвет»?

Артыкулы ў «ДУМКІ й пагляды» ня могуць быць доўгімі ды абы якімі. Ананімных артыкулаў да друку ня прымаем.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

THE GOLDEN AGE OF BYELORUSSIAN CULTURE

INTRODUCTION

Byelorussia, a charter member of the United Nations, and today a constituent Republic of the U.S.S.R., is a country of rich cultural and national heritage dating back a thousand years. Soviet Russia is using its "Operation Rewrite" to obscure this fact and in its place promotes its own thesis, namely that only with Soviet help did the Byelorussian people attain their nationhood.

In reality, the political and cultural role that Byelorussia played, especially during the time of its "Golden Age" in the 16th century, had a paramount impact on Eastern Europe. In Byelorussia this was an era characterized by advanced democratic basis of life and by religious and political tolerance hardly found anywhere else in Europe at that time. While most of Europe suffered from the effects of religious fanaticism, from persecutions and from inquisitions, the enlightened atmosphere in Byelorussia permitted Symon Budny, a philosopher, theologian and a disciple of Michael Servetus, to freely preach, publish and to disseminate his religious ideas. This took place at the time when in Geneva, Michael Servetus was burned at the stake for his "heretic beliefs".

It was this tolerance of all ideas and an almost unlimited freedom of speech, conscience and faith, which led Todar Eulasheuski, a Byelorussian writer of the late 16th century, to call that century golden.

Historically Byelorussia was known as Litva and the Byelorussian State as the Grand Duchy of Litva. The name Byelorussia was introduced during the Russian occupation of the Grand Duchy in the 18th and 19th centuries and has since then gradually gained acceptance. Litva should not be confused with the present day Lithuania, which under its historical name of Zhamoyc (Samogitia in Latin), was but a small part of the Grand Duchy to which it was semi-permanently annexed. On several occasions Zhamoyc was traded by the Grand Duchy in return for favorable military settlements.

BYELORUSSIA – THE CROSSROADS OF EAST AND WEST

During the last quarter of the 15th century, the Grand Duchy of Litva attained its maximum territorial expansion, encompassing vast territories from the Baltic to the Black Seas. To the east the boundary reached to within eighty miles of Moscow. Byelorussian lands formed the nucleus of this huge state and Byelorussian people were its masters both politically and culturally.

Simultaneously with the territorial growth of the Grand Duchy, commerce expanded. The rivers Nioman, Dzvina, Dniapro, and various overland trade routes connected Byelorussia with countries of Western and Eastern Europe. Along these routes also came new cultural and spiritual ideas and influences of the Western and Byzantine civilizations. The synthesis of these two cultural elements occuring on the substrata of Byelorussia's own national traditions later became the cultural characteristic of the Byelorussian people.

Cultural ties of Byelorussia with the West were also maintained through the educational opportunities which Byelorussian youth found at the Universities in Prague, in Germany and in Italy. A great number of Byelorussian statesmen, officials and well-to-do citizens used this opportunity to educate their sons, and through them Byelorussia was exposed to a continuous stimulating flow of progressive and bold ideas of the Renaissance and the Reformation.

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

Especially fruitful contacts with Western Europe were in the arts - painting, architecture, and graphic arts. Churches, castles, palaces and city halls were being built or renovated in the Gothic style, in the styles of the Renaissance and later in the Baroque style. In the 16th century an original Byelorussian building style was developed which combined harmoniously the Gothic and Byzantine forms with local architectural traditions. Excellent examples of this "Byelorussian Gothic" style are the churches in Mazheiki, Synkavichy and Suprasl.

BYELORUSSIAN – AN INTERNATIONAL LANGUAGE

An important prerequisite for the fast pace of development of Byelorussian writing and literature during the "Golden Age", was the high level of development of the Byelorussian literary language attained previously. For centuries the Byelorussian language was not only the language of everyday use and religious writing, but also the official language of the Government of the Grand Duchy of Litva, and not only in Byelorussian lands, but also in all other lands comprising this state.

Byelorussian language was used widely by the Orthodox Church which served 80% of the population of the Grand Duchy. Only in liturgy and other prescribed services was Church-Slavonic retained. The Catholic Church of the Grand Duchy used Byelorussian side-by-side with Latin. Scholars and preachers of the Reformation used Byelorussian language in their writings and publications. In the 16th century, Byelorussian was also introduced into the Holy Books (Koran) of a small but politically significant Muslim population of the Grand Duchy.

The dominant political and cultural position of the Grand Duchy in Eastern Europe inevitably led to the wide use of Byelorussian language beyond its borders. Trade and peace agreements with other states of Eastern Europe were written in Byelorussian. The great Dukes used Byelorussian language in their correspondence and relations with the rulers of states and regions of Eastern Europe, among them Muscovy (Russia), Great Novgorod, Tver, Pskou, the then German Riga, Poland, Moldavia, Walakhia, and the Tartar Khanates. The rulers of these states, as a rule, replied to Great Dukes of Litva also in Byelorussian.

Latin was the only other language used by the Grand Duchy in diplomacy, and its use was limited to relations with Western Europe.

Thus during the 15th and 16th centuries Byelorussian language played an international role in the diplomatic relations of Eastern Europe similar to that of Latin in the West. For example, when in 1646 a dispute arose between Poland and Moscow concerning the language which was to be used in their diplomatic relations, the settlement came only after they both agreed to return to the established tradition - the use of the Byelorussian language.

AN ADVANCED LEGAL SYSTEM

The ancient democratic traditions of the Byelorussian people and a mass of accumulated legal and judicial records, provided just the right conditions for a high level of development of law in Byelorussia during the "Golden Age".

Codification of law had already begun in the 15th century and in 1468 the first compilation of laws of the Grand Duchy, entitled "The Judgement Book", was completed. However, it wasn't until the 16th century that the high level of Byelorussian legal system was reached with the publication of the judicial code of the Grand Duchy known as the "Litouski Statut". The basic principles embodied in this code were deeply rooted in the traditional norms of Byelorussian common law.

Following two handwritten editions of 1529 and 1566, the first printed edition of the "Litouski Statut" appeared in 1588, and because of its completeness be-

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

came one of the most authoritative judicial codes in Europe. Byelorussia's neighbors, the despotic Moscow and the anarchist-aristocratic Poland did not at that time attain a similar achievement in the legal field.

The chief editor and publisher of the third edition of the "Litouski Statut" was the Chancellor of the Grand Duchy, Leu Sapieha (1577-1633). In all three of its editions, "Litouski Statut" was written in Byelorussian. Later it was translated into Latin, Polish, Russian and German. The "Litouski Statut" remained in use for three centuries, and was used even after the Russian occupation of Byelorussia. It was only in 1839 that the judicially binding force of the code was terminated by Czar Nicholas I and Russian laws were universally imposed.

CHRONOLOGY

Chronology was another field which reflected the vigorous political and national life of the Byelorussian nation. During the 16th century there appeared a large number of new editions of old chronicles as well as a host of new chronicles. The more important chronicles that have survived the turbulent events of history are the chronicles of Bykhaviets, of the Great Dukes, of the Dukes of Slutsk, chronicles of Krasinski and Baczynski, and a whole series of lesser local chronicles.

BYELORUSSIAN PRINTING

A very important factor in the development of Byelorussian written "Golden Age" was the birth of Byelorussian printing at the beginning of the 16th century. The foremost pioneer of Byelorussian printing was a renowned scientist and humanist of his time, Francisak Skaryna (1485?-1540). After obtaining his Doctorate in Medicine from the Padua University in Italy, Francisak Skaryna set forth as his main goal the dissemination of knowledge and education among his own people with the aid of printed books, and in the language best understandable to them, that is in his native Byelorussian. In 1517-19 in Prague and later in 1522-25 in Vilna, Skaryna published the books of the Bible in Byelorussian translation. This was the first Bible printed in Eastern Europe and one of the first in the world.

Commentaries and introductions to Skaryna's books were filled with expressions of intense patriotism, love of the common people and with religious tolerance. Historians of printing refer to Skaryna's richly decorated and illustrated books as "Slavic Elsevir". Skaryna's varied interests and activities, typical of the learned men of Renaissance, left a legacy in many areas of Byelorussian cultural life - in religion, literature, art, linguistics, as well as in printing.

Following in Skaryna's footsteps were such men as Symon Budny, Vasil Ciapinski, Vasil Haraburda, Peter Mscislaviec, brothers Lukas and Kuzma Mamonich, Ryhor Chadkievich, and the Orthodox Brotherhood of Vilna. By the end of the "Golden Age" there were over ten publishing houses in Byelorussia. Their books could be found not only throughout Byelorussia, but also in the territories of the southern Slavs and even in Moscow despite the fact that there they were banned and often burned as "heretic".

Printed literature was used extensively by the Byelorussian Reformation movement, forcing the Orthodox and the Catholics into a lively debate in print. Consequently, an extensive religious and polemic literature had been accumulated by the second half of the "Golden Age".

The most prominent representative of the Byelorussian Reformation movement was Symon Budny (1530?-1593), a philosopher and a student of the Bible. Budny, first a Calvinist, and later the leader of Byelorussian Unitarians, was a prolific writer of polemic letters and theological treatises which he wrote in Byelorussian, Polish and Latin, and distributed in Switzerland, England, Prussia, Poland, Hungary, and in Byelorussia. Budny's main work in Byelorussian is a large

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

theological treatise "Katykhyzis" (Niasviz, 1562) which lays down the basis for his reformist ideas and expresses his views on the main social problems of that time.

Among the Orthodox, a notable activist and a reformer of the Orthodox Church of the "Golden Age" was the Metropolitan of the Grand Duchy, Jazep Soltan (Metropolitan in the years 1497-1519). A prolific contributor to Byelorussian Orthodox writing was Archimandrite Siarhei Kimbar (1532-1565) of the Suprasl Monastery. The second half of the century marks important literary and editorial activity by Ryhor Chadkievich (1505-1572). In 1575 Orthodox books were being printed in Vilna by Peter Mscislaviec. Famous for both their quality and the number of religious books published, were the Vilna publishing houses of Mamonich Brothers and of the Holy Trinity Brotherhood.

EDUCATIONAL AND SECULAR LITERATURE

Along with the general rise of the educational level in Byelorussia, the need for textbooks and reference books also increased. Publishers of religious books of all denominations turned their attention to this need. Special credit goes to the Orthodox Brotherhood in Vilna which published Byelorussian grade school readers, Byelorussian grammar and textbooks, and in 1595 published the first Byelorussian dictionary and lexicon edited by Laurenci Zyzani, an educator, scholar and theologian. Zyzani's Byelorussian grammar later became the primary source material for the Russian grammar of Michael Lomonosov.

In the field of secular literature both Byelorussian and Latin were used. In 1521, during his stay in Rome, Mikola Husouski wrote a poem for Pope Leo X, entitled "The Song of the Zubr". This poem of nearly 2000 stanzas was written with remarkable talent and presents vividly the beauty of Byelorussian wilderness and masterfully describes a relative of the bison - zubr, the king of Byelorussian forests. It further describes all the dangers of hunting the zubr, and clearly reflects poet's love for his country and his views on the major political events of his time. Also in Latin, Michael Litvanus published "The Habits of Tartars, Lithuanians (Byelorussians) and Muscovites (Russians)". In the years 1573-74, Filon Charnabylski of Orsha wrote in Byelorussian his "Vodpisy" (Reports). During the last quarter of the century poet John Radvan glorified Byelorussian magnates, his benefactors, with his Latin poems. A "Diary" describing a wealth of topical and historical events was written in Byelorussian by Todar Eulasheuski (1546-1604?).

CONCLUSIONS

This short survey points to a record of remarkable cultural and political achievements of the Byelorussian people and of the Byelorussian State, the Grand Duchy of Litva. In the 16th century, this level of accomplishment could not even be approached by Moscow, Poland or any other state in Eastern Europe. This is also the record which Soviet Russia tries to camouflage and falsify, thereby attempting to deny the cultural inheritance and historical achievements of the Byelorussian people. In this connection the change of names from the historical Litva to Byelorussia and from the historical Zhamoyc (Samogitia) to Lithuania, contributes to the confusion which the Russians exploit. However, a heritage of this scope and an abundance of documentary evidence from the era of the "Golden Age" still in existence, can not be suppressed either by might or by fraud.

Published by the Byelorussian-American Association

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

Магутны Божа

Муз. М. Равенскага

Словы Н. Арсеньнявай



Грэнд Рэпідс, ЗША. — 1983

Перавыданьне Міколы ПРУСКАГА

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

Магутны Божа

Andante



© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

Магутны Божа! Ўладар сусьветаў,
Вялікіх сонцаў і сэрц малых!
Над Беларусяй, ціхай і ветлай,
Рассып праменьні свае хвалы.

Дай спор у працы штодзеннай, шэрай,
На лусту хлеба, на родны край,
Павагу, сілу і веліч веры
У нашу праўду, у прышласьць — дай!

Дай урадлівасьць жытнёвым нівам,
Учынкам нашым пашлі ўмалот!
Зрабі магутнай, зрабі шчасьлівай
Краіну нашу і наш народ!

Mahutny Boža! Ůładar suśvietaŭ,
Vialikich soncaŭ i serc małych!
Nad Biełarusiaj, cichaj i vietłaj,
Rassyp pramieńni svaje chvały.

Daj spor u pracy štodziennaj, šeraj,
Na łustu chleba, na rodnyj kraj,
Pavahu, siłu i vielič viery
U našu praŭdu, u pryšłaść — daj!

Daj uradlivaść žytniovym nivam,
Učynkam našym pašli ŭmałot!
Zrabi mahutnaj, zrabi ščaślivaj
Krajinu našu i naš narod!

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013

© PDF: Kamunikat.org 2013